**Міхно, У.** Эх, мароз, мароз! / У. Міхно // Чырвоны прамень (Чашнікі). — 2006. — 14 лют. — С. 3.

**ЭХ, МАРОЗ, МАРОЗ!**

Люты. Раніца. Мароз пад дваццаць. Хлопцы-вадзіцелі камунгаса зранку завіхаюцца ля капотаў сваіх машын, бегаюць з вёдрамі па гарачую ваду, ідуць у ход паяльныя лямпы. Назіраю, як спрытна спрабуе ажывіць-завесці свой «КС 3575А» Васіль Кулакоўскі і між волі зайздрошчу яго, бадай, падлеткаваму спрыту.

– Колькі ж вам год? – пытаюся на ўсякі выпадак. Можа, я памыліўся і перада мною не былы воін-афганец, а хтосьці іншы, маладзейшы.

– Сорак, – Васіль, спрытна ўчапіўшыся адной рукою за крук, шустранька коўзае пад свой кран, кладзецца на зямлю. У другой руцэ ў яго паяльная лямпа. Нешта разагравае. Потым ўскоквае, хапае вёдры, бяжыць па кіпень.

І неўзабаве яны з маладым напарнікам трыумфуюць. Вялікі жоўта-чырвоны кран раптам ажывае, пачынае пыхцець, гудзець усё болей ўпэўнена і меладычна і нарэшце – заводзіцца.

Эх мароз, мароз... За гэты час, пакуль Васіль заводзіць кран, паспяваю зрабіць колькі фотаздымкаў. Цяпер можна схавацца ў цёплай дыспетчарскай і пагаварыць капітальна.

– Колькі ж тут, у Чашніках, у ЖКГ, працуеце?

– Ды ўжо дзевяты год. А ўсяго шаснаццаць. Дагэтуль у Чашніцкай ПМС працаваў, адразу ж пасля... вайны, і на кранаўшчыка вучыўся ў Гомелі.

Цікава, як яму ўдалося захаваць і ў сорак тую салдацкую жывінку, тую падлеткавую юрлівасць? Што й казаць, не ўсе яны вярнуліся з Афганістана, нават тыя, хто… адтуль вярнуўся бадзёрым і жыццярадасным. Даруем жа ім іх скруху, часам раздражняльнасць, часам капрызнасць. Даруем ім іх знявечанае вайной светаўспрыманне. А яны няхай даруюць нам, што не мы, а яны сталі ахвярамі той далёка не адназначнай вайны.

...А загартоўвалі Васіля Кулакоўскага, сялянскага хлопца з чашніцкай вёскі Асташова, плуг ды каса. Той гарт спатрэбіўся і на вайне... Школа ў Вяжоўцы, аўташкола ў Докшыцах, армія. Звычайная ў юнака біяграфія. А зважаючы на тое, што нарадзіўся у 1966 годзе, звычайнаю падасца і далейшая, ужо армейская дарога – цягніком з Віцебска ў Фергану, у вучэбку. Самалётам – на Баграм, у 345-ы полк асобнай Гвардзейскай парашутна-дэсантнай дывізіі.

Перад вачыма стомленых гарачынёй хлопцаў паўстаў малюнак вайны, да якой яны рыхтаваліся больш як чатыры месяцы. Але ж хіба могуць вочы да вайны прывыкнуць?

Зрэшты, чалавек прывыкае да ўсяго... Праўда, першы месяц у Афганістане сядзелі як бы на каранціне, і іх ніхто не чапаў. А першым разам выйшлі на «брані» (бронетэхніка) у Пандшэрскую цясніну. «Духі» стралялі спачатку па пастах, а затым прайшліся і па калоне. Кепска сябе пачуваеш, хаця і са зброяй, пад агнём нябачнага праціўніка. І няпраўда, што на вайне не бывае страшна. Усе мы людзі, усе мы хочам жыць. А каму суджана выжыць пад кулямі, ведае толькі Бог...

Дзякуй Богу, той раз абышлося малой крывёю: адзін паранены, адзін кантужаны...

– ...А потым не тое каб прывыкаеш, але ўцягваешся ў гэтую дурную вайну, – махае скрушна Васіль рукою.

– Чаму дурную? Так, зараз модна называць афганскую вайну памылкаю, непаразуменнем, нават злачынствам. Але ад самога «афганца» такое вызначэнне чую ўпершыню. Звычайна ваш брат абараняе тую часіну суровых сваіх юначых выпрабаванняў. І гэта зразумела...

– На той вайне ніхто з нас не ведаў, што, куды і навошта. І ніхто афганцаў неераможа, ніхто...

У вайну уцягваешся. Вось на свае вочы бачыш першага параненага. Хоць і вораг, а пачуцці супярэчлівыя. А потым і першага сябра праводзіш у медсанбат. Ён паранены з буйнакалібернага кулямёта. Ён едзе у Саюз, а тыя, хто застаецца пакуль у пекле, яму зайздросцяць, хаця зайздросціць няма чаго, бо хлопец інвалідам застанецца на ўсё жыццё... Наперадзе ў Васіля былі дваццаць месяцаў вайны, семнаццаць баявых выхадаў. У абавязак вадзіцеля «Урала» і эвакуацыйнага цягача, якімі кіраваў Кулакоўскі, уваходзіў падбор пашкоджанай баявой тэхнікі, якая яшчэ магла прыгадзіцца. А тую тэхніку, якую не маглі вывезці, падрывалі на месцы, каб не дасталася ворагу. Лішняе казаць, што задачу гэтую даводзілася выконваць часта пад кулямі. І чаму ніводная з іх за ўсе дваццаць месяцаў вайны так і не зачапіла Васіля, ведае таксама хіба адзін Бог. І яшчэ цётка родная, якая хадзіла ў царкву памаліцца за пляменніка. Тройчы цётцы прысніўся ён у баі, але жывым. Тройчы і сапраўды яму на полі бою было асабліва горача.

За адзін такі бой Васіль Кулакоўскі атрымаў баявую ўзнагароду – медаль «За баявыя заслугі». То была гарачая Пандшэрская аперацыя...

Не любяць воіны-інтэрнацыяналісты варушыць тую вайну, не любяць узгадваць да драбніц дэталі сваіх баявых аперацый. Іх можна зразумець. Каму ахвота вярэдзіць крывавыя раны, якія ў памяці дагэтуль так і не загаіліся. Для нас Афганістан – штосьці далёкае, неакрэсленае, незразумелае. Для іх жа, «афганцаў», – вечна жывая і незагойная рана...

Куды з большай ахвотаю прыгадвае Васіль 28 красавіка 1986 года – дэмбель. Не было самалёта – і яшчэ шэсць дзён давялося чакаць адпраўкі ў Саюз. І нарэшце – 6 мая – з Баграма самалётам у Кабул, адтуль жа – на Ташкент. І – бывайце, саракаградусная спякота і начныя замаразкі. І бывай, Саланч, з белаю снегавою шапкаю. І – бывай назаўсёды вайна.

...Зноў звычайная, сціплая біяграфія працоўнага простага чашніцкага хлопца. Сям'я. Жонка-настаўніца. Дзве школьніцы-дачкі. Праца. Сябры, з якімі раз ці два ў год выпадае сабрацца... Коля Завальны з Новалукомля і Коля Васілеўскі з Чашнік, Васіль Пясецкі і Сяргей Крэміс. Яны таксама служылі ў той самай дывізіі... Сабрацца... Разам падняць «франтавыя сто грамаў». За тых, хто ёсць, і тых, каго няма. Вайна зрабіла іх усіх братамі...

**У. Міхно**